Іваненка Мікалай Міхайлавіч,
кіраўнік раённага рэсурснага цэнтра па духоўна-маральным выхаванні пры Дзяржаўнай установе адукацыі «Вілейская гімназія № 2»

«Историко-краеведческая работа в учреждениях образования»

# Гонар нашай зямлі.
# Жыццё і дзейнасць протаіерэя Понція Рупышава

Праваслаўнае краязнаўства – адзін з самых цікавых і змястоўных накірункаў дзейнасці раённага рэсурснага цэнтра па духоўна-маральным выхаванні на праваслаўных традыцыях і каштоўнасцях беларускага народа, які ўжо больш за 15 год працуе на базе Дзяржаўнай установы адукацыі «Вілейская гімназія № 2».

Прычынай нашай асобай цікаўнасці да жыцця і дзейнасці святара Понція Пятровіча Рупышава з'яўляецца той факт, што напачатку свайго служэння (з лістапада 1901 года па жнівень 1905 года) ён быў настаяцелем Вілейскай Свята-Марыінскай царквы і ў нашай прыхадской гісторыі пазначаны як выдатны падзвіжнік 20-га стагоддзя [7, с. 84].

З 2001 года праваслаўная суполка сяла Міхнова (Мікнішкес) Шальчынінкскага раёна Літвы выступае з ініцыятывай кананізацыі протаіерэя Понція Рупышава, які арганізаваў гэтую суполку ў 1921 годзе і на працягу 18 год быў яе духоўнікам. Насельнікі не сумняваюцца ў яго святасці, бо назіраюць, як сбываюцца прадказанні, і адчуваюць малітоўную прысутнасць бацюшкі ў сваім паўсядзённым жыцці.

З 2017 года ў Маскве праведзена 8 Міжнародных Рупышаўскіх чытанняў, на якіх прадстаўлены дзясяткі дакладаў студэнтаў, светароў, вучоных і багасловаў на самыя розныя тэмы духоўнай спадчыны протаіерэя Понція – ад цнатлівасці ў сямейным жыцці да выратавальнага значэння жыццёвых пакут. Шмат даследаванняў прысвечана Міхноўскай хрысціянскай суполцы, якая і сёння ўражвае суладдзем штодзённага быту, малітоўнай узвышанасцю атмасферы жыцця і амаль казачнай незвычайнасцю прыроднага асяроддзя (аднойчы вілейскія паломнікі ў Міхнове налічылі на адной з ліп 27 буслоў). Даследавана амаль усё, што звязана з жыццём і духоўнасцю Понція Рупышава, але, напэўна, ні разу не рабілася спробы паглыбіцца ў прычыны ўстойлівасці і доўгажыхарства Міхноўскага праваслаўнага згуртавання.

Понцій Рупышаў быў духоўным сынам Іаана Кранштацкага, які пры першай жа сустрэчы назваў яго сваім сябрам і братам, а пазней, калі Понцій прыехаў за благаславеннем на складаную аперацыю, цудам пазбавіў яго ад небяспечнай хваробы. Трэба адзначыць, што бацюшка на працягу ўсяго свайго жыцця быў хваравітым і фізічна кволым. Пры гэтым ён меў адметную харызму, валодаў выключным дарам слова і быў моцным

духоўна, у сцвярджэнне слоў Апостала Паўла, што сіла Божая ў немачы здзяйсняецца [5, с. 413]. Па гэтай духоўнай сіле Бог даваў айцу Понцію і моцныя выпрабаванні. З дзяцінства ён марыў стаць манахам, але па настаянні свайго бацькі і па благаславенні епіскапа ажаніўся. Сям'я жыла вельмі сціпла, бо бацюшка быў бяссярэбраннікам. Калі яны з жонкай здымалі кватэру ў Вілейцы, то, як напісана ў Вілейскай царкоўнай гісторыі, усе рэчы памяшчаліся ў адным кошыку [7, с. 89].

Амаль на кожным месцы свайго служэння святар Понцій Рупышаў сутыкаўся з супярэчнасцямі, якія патрабавалі ад яго ўпартага стаяння ў веры. Так у Вілейцы сваім шчырым і адданым пастырствам (пасля царкоўных служб і трэб хадзіў па хатах сваіх прыхаджан, тлумачыў асновы веры, раздаваў іконы і крыжыкі, у каго іх не было, старанна працаваў у школах і бібліятэцы, патрабаваў дысцыпліны: не дазваляў размаўляць падчас набажэнстваў, не прымаў п'яных кумоў, не вянчаў на п'яных вяселлях і г.д.), адказам ад платы за трэбы ён вызваў непрыязнасць мясцовага духавенства і некаторай часткі вернікаў. Былі выпадкі, калі ў яго нават кідаліся каменнямі [7, с. 90], пісалі даносы епіскапу [4, с. 10]. Але простыя людзі любілі свайго бацюшку і далёка не ўсе святары былі меркантыльнымі і зайздроснымі. Айцец Понцій шчыра пасябраваў з протаіерэем Паўлам Сасноўскім, які ў той час з'яўляўся настаяцелем Нарачанскай Свята-Ільінскай царквы, членам савета благачыння і потым, у 1944 годзе, быў забіты немцамі.

Падчас працы ў Бабруйску было заўважана, што Понцій Рупышаў мае вялікі ўплыў на моладзь. Маральныя межы людскіх паводзінаў тады разбураліся, адчувалася рэвалюцыйная напружанасць, штогод расла колькасць злачынстваў і парушэнняў грамадскага парадку [6, с. 51-56]. Святара перавялі ў Магілёў, дзе асабліва востра стаялі праблемы моладзі, з надзеяй, што ён дапаможа іх вырашэнню. Але супраць адметнага бацюшкі паўстае мясцовы епіскап, і айцец Понцій пераездждае ў Петэрбург, дзе потым служыць святаром на Балтыйскім флоце. У 1918 годзе з-за «чырвонага тэрору» ён спешна ад'язджае ў Прыбалтыку, пазбаўляецца зносінаў з жонкай і дзецьмі і больш ніколі не пабачыць іх.

Маёнтак за 30 кіламетраў ад Вільні, куды ў 1921 годзе прыехаў святар Понцій Рупышаў і ў якім потым згуртавалася Міхноўская праваслаўная суполка, належаў удаве А.Д. Карэцкай і тром яе дочкам, якія вялі свецкі вобраз жыцця. Час быў супярэчлівы і трывожны. Вось як характарызуе яго святар Еўстафій Баслык, які вучыўся тады ў Віленскай духоўнай семінарыі: «Становішча мясцовых жыхароў было далікатным. У сувязі з вайной ніхто нас не мілаваў. І адзін і другі бок (Польшча і Расія) стараліся выкарыстаць нашы рэсурсы ў сваіх мэтах, а жыхары стараліся ад адных і ад другіх зберагчы свае жыцці і маёмасць» [1, с. 29]. Малалюдныя прыходы, спусташоныя цэрквы, страх і нявызначанасць – умовы жыцця праваслаўных у тыя часы. Да таго ж Віленская губернія была адной з

самых акаталічаных у Паўночна-Заходнім краі. Па перапісе насельніцтва 1897 года ў ёй пражывала каля 1 600 000 чалавек [3, с. 6], з якіх каля 957 000 лічылі сябе католікамі [2, с. 234]. У 1923 годзе пад націскам урада Польская Праваслаўная Царква аб’явіла аўтакефалію, якую прызнаў Канстанцінопальскі Патрыярх. Частка духавенства і вернікаў адыйшла да аўтакефаліі, а другая частка засталася вернай Патрыярху Маскоўскаму. Усе гэтыя і іншыя абставіны адмоўна ўплывалі на арганізацыю Міхноўскай суполкі і стваралі невыносныя ўмовы. Трэба сказаць, што міхноўцы жылі ў такіх умовах больш за 70 год. Войны, непрыязнасць уладаў, непаразуменні ўнутрыцаркоўныя, арышты, высылкі і прыгнёт савецкага часу (калі ім давялося афіцыйна аформіцца калгасам, які потым быў расфарміраваны), мноства іншых напасцяў так і не змаглі разбурыць суполку – людзі разам жылі і маліліся ў сваёй царкве, якая таксама ніколі не зачынялася.

Якую сілу пераканання трэба было мець святару Понцію, каб сёстры Карэцкія з паненак сталі сапраўднымі воінамі Хрыстовай веры і ахвяравалі дзеля гэтай веры не толькі маёмасць, але і свае жыцці? Якую сілу духу і розум трэба было мець, каб і пасля смерці яго справа жыла насуперак непрыязным абставінам і плыням жыцця? Сектанты і іншаверцы, якія пад уздзеяннем слова бацюшкі Понція пераходзілі ў праваслаўе, называлі галоўную прычыну свайго рашэння: «Ваш святар жыве так, як вучыць» [4, с. 27]. Аснова шчырай пропаведзі – асабісты прыклад жыцця па веры. Гэта набывае асаблівую актуальнасць і ў нашы дні.

«Дык вось, кожнага, хто слухае гэтыя словы Мае і выконвае іх, прыраўняю да мужа разумнага, які пабудаваў свой дом на камені. І пайшоў дождж, і разліліся рэкі, і падзьмулі вятры, і рынуліся на той дом; і ён не ўпаў, бо закладзены быў на камені» [5, с. 16].

На прынцыпах высокай духоўнасці протаіерэй Понцій стварыў і сацыяльна-эканамічную мадэль Міхноўскага хрысціянскага згуртавання, якое жыве, вядзе вялізную гаспадарку і сёння. У чым адметнасці такой мадэлі?

Па-першае, камуністычны ідэал вытворчасці і размеркавання «ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па патрэбах», які так і застаўся нерэалізаванай марай, тут ажыццявіўся ў поўнай меры з першых дзён існавання таварыства і не парушаўся на працягу ста год.

Па-другое, эканамічныя, сацыяльныя і экалагічныя пытанні тут заўсёды паўстаюць і вырашаюцца ў гарманічным адзінстве, што ў нашы дні эканамісты называюць асноўнымі фактарамі ўстойлівага развіцця.

Па-трэцяе, такія сацыяльна-эканамічныя праблемы як рынкі збыту, аб’ёмы прадаж, задаволенасць спажыўцоў, аварыйныя сітуацыі і няшчасныя выпадкі, вытворчасць прадукцыі нізкай якасці і многія іншыя, вырашэннем якіх занятыя сотні спецыялістаў на прадпрыемствах, тут вырашаюцца самі сабой. Ніхто не хаваецца ад працы, ніхто не будуе

кар’еру, ніхто не шукае сваіх выгод і ні с кім не спаборнічае. Малітва, пост і дружная радасная праца. Гэта іх гаспадарка, кожны працуе без надрыву і мітусні ў меру сваіх здольнасцяў і сіл, ідзе на дапамогу іншым. Тут усе роўныя і ў працы, і ў размеркаванні, але дзіўным вобразам у працы кожны стараецца больш узяць на сябе, а пры размеркаванні – аддаць іншым. Яны шчыра даглядаюць сваіх старэнькіх і нямоглых, як родных, яны клапоцяцца аб кінутых дзецях, яны ўтрымліваюць вялізарную тэрыторыю ў чысціні і райскай прыгажосці. Яны заўсёды разам: на малітве, на працы, у трапезнай. Нават у манастырах мы можам на погляд адрозніць: гэтая манахіня простая, а гэтая – не зусім… Тут жа ўсе простыя. Гэта не ідэалізаваная выдумка, а праўда.

Яны не манахі, нікому і ніякіх абяцанняў не давалі. У любы час могуць пакінуць суполку і вярнуцца дамоў. На сёння там жывуць у трох вёсачках на адлегласці паўтара-два кіламетры больш за 70 чалавек і ніхто з іх не хоча іншага жыцця.

Вілейка яшчэ з часоў бацюшкі Понція заўсёды трымала цесную сувязь з Міхновам. І зараз ужо больш за 20 год жывуць сярод міхноўцаў вілейчанкі Наталля Мароз і Алена Ушал. Першая спачатку працавала на пасецы, а зараз яна старэйшая на кароўніку. Старэйшая сама пасе і доіць кароў. Другая адказвае за бібліятэку і вядзе летапіс суполкі, а яшчэ яна старэйшая на цяпліцах.

Ёсць сярод насельнікаў Даніэла Шульц. Яна прыехала з Германіі і засталася ў Міхнова назаўсёды. Адказвае за перапрацоўку малака, яе завуць малочніцай, а яшчэ яна кіроўца грузавой машыны і выконвае мантажна-зварачныя работы.

У суполцы шмат цікавых людзей, усе яны вельмі розныя, але жывуць адзінай сапраўды праваслаўнай сям’ёй. Ёсць і праблемы: не хапае мужчынскіх рук і жанчынам прыходзіцца выконваць цяжкую працу.

Што іх сілкуе? Любоў! Да Бога, да людзей, да жыцця. Жыцця чыстага, праведнага. Міхноўская суполка на практыцы сцвярджае нам вялікую праўду слоў Святога Дабравесця: «Шукайце ж найперш Царства Божага і праўды Яго, і гэта ўсё дадасца вам» [5, с. 14].

Працуючы над матэрыяламі даследавання жыцця і дзейнасці протаіерэя Понція Рупышава, мы з вучнямі гімназіі прыйшлі да слушнай высновы: напэўна ўсе нашы асабістыя і грамадскія праблемы (духоўныя, эканамічныя, экалагічныя, сацыяльныя, сямейныя і іншыя) ад таго, што мы ўпарта шукаем царства зямнога...

Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры

1. Баслык, Е. Записки священника Евстафия / Е. Баслык. – Минск: Лучи Софии, 2005. – 256 с.

2. Киприанович, Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве / Г.Я. Киприанович. – Минск: Издательство Белорусского экзархата, 2006. – 352 с.

3. Население империи по переписи 28-го января 1897 года по уездам / Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / Издание центрального статистического комитета Министерства внутренних дел. – С-Петербург, 1897 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://istmat.info//files/uploads/15771/perepis 1897_vypusk_1. pdf. – Дата доступа: 29.11.2021.

4. Не оставлю вас сиротами. Жизнеописание и благодатные мысли протоиерея Понтия Рупышева / Сост. В.А. Корецкая. – Москва: Паломник, 1999. – 175 с.

5. Новы Запавет Госпада нашага Іісуса Хрыста / Пераклад з грэчаскай на сучасную беларускую мову Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы; адказны рэдактар перакладу протаіерэй Сергій Гардун. – Мінск: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора: Медыял, 2017. – 544 с.

6. Обзор Могилевской губернии за 1906 год / Могилев. губ. стат. комитет. – Могилев на Днепре, 1871-1915 // Электронная библиотека ГПИБ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://elib.shpl.ru/ru/nodes/46562-za-1906-god-1907#mode /inspect/page/ 91/zoom/4. – Дата доступа: 29.11.2021.

7. Церковная история города Вилейки: приход во имя Преподобной Марии Египетской в 2-х частях: ч. 1. Сост. Н.А. Ефимова. – Минск: Ковчег, 2013. – 144 с.